***Чуханава К. А.***

**ПРАБЛЕМА МЕДЫЦЫНСКАЙ ДЭАНТАЛОГІІ Ў АПОВЕСЦІ АНДРЭЯ ФЕДАРЭНКІ «ЛАНЦУГ»**

***Навуковы кіраўнік ст.выкл. Ратынская Н. В.***

*Кафедра беларускай і рускай мовы*

*Беларускі дзяржаўны медыцынскі універсітэт, г. Мінск*

**Актуальнасць.** артыкула абумоўлена адсутнасцю навуковых прац, прысвечаных аналізу праблемы медыцынскай дэанталогіі ў сучаснай беларускай літаратуры.

**Мэта:** ахарактарызаваць праблему медыцынскай дэанталогіі ў рамках аналізу аповесці Андрэя Федарэнкі «Ланцуг».

**Асноўныя задачы:**

1. Апісаць «маральныя праграмы» герояў аповесці з пазіцый асноўных палажэнняў Міжнароднага кодэксу дэанталогіі;

2. Выявіць адпаведнасць/неадпаведнасць паводзін і ўчынкаў герояў аповесці «Ланцуг» асноўным хрысціянскім запаведзям.

**Матэрыял і метады.** Апісальны, кантэкстуальны. У якасці матэрыялу выкарастана аповесць Андрэя Федарэнкі «Ланцуг».

**Вынікі:** Прааналізаваны «маральныя праграмы» хірургаў Івана Змітравіча Стэльмаха і Яўгена Вінярскага з пазіцый асноўных палажэнняў Міжнароднага кодэксу дэанталогіі; устаноўлена карэляцыя паводзін і ўчынкаў герояў аповесці «Ланцуг» з асноўнымі хрысціянскімі запаведзямі.

**Вывады:**

1. Праблема медыцынскай дэанталогіі адносіцца да ліку ўсеагульных і мае багатую гісторыю: яе актыўна абмяркоўвалі яшчэ ў часы філасофа-уцілітарыста Бентама, на ёй акцэнтавалі ўвагу ў час прыняцця Міжнароднага кодэксу дэанталогіі ў кастрычніку 1949 года. Аб ёй гавораць і сёння, і не толькі ў спецыяльнай, але і ў мастацкай літаратуры.

2. Традыцыйна тэрмін «дэанталогія» ужываецца ў двух сэнсах – шырокім (раздзел этыкі, у якім разглядаюцца праблемы абавязку і належнага) і вузкім (прафесійная этыка, прынцыпы паводзін медыцынскага персаналу, якія накіраваны на максімальнае павышэнне эфектыўнасці лячэння).

3. «Маральныя праграмы» хірургаў Івана Змітравіча Стэльмаха і Яўгена Вінярскага па-рознаму суадносяцца з асноўнымі палажэннямі Міжнароднага кодэксу дэанталогі і хрысціанскімі запаведзяміі: для Стэльмаха прыярытэтнымі з'яўляюцца інтарэсы пацыента, павага да чалавечай годнасці (пар.: «па-за залежнасці ад спецыялізацыі ўрач павінен поўнасцю адказваць за ўсе аспекты медыцынскай дапамогі»; «па адносінах да сваіх калег урач павінен весці сябе так, як ён хацеў бы, каб яны вялі сябе па адносінах да яго»); хірург Вінярскі ненавідзіць хворых, адносіцца да іх як «матэрыялу, які дапаможа набіць руку».